Установа адукацыі
“Беларускі дзяржаўны універсітэт культуры і мастацтваў”

**ЗАЦВЯРДЖАЮ**
Першы прарэктар
УА “Беларускі дзяржаўны
універсітэт культуры і мастацтваў”
____________ Ю.П.Бондар
“____” _____________2010 г.
Рэгістрацыйны № ВД-____/ баз.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

# УВОДЗІНЫ Ў СПЕЦЫЯЛЬНАСЦЬ

*Вучэбная праграма*
*па спецыяльнасці 1-21 04 02*
*Мастацтвазнаўства (па напрамках),*
*напрамку спецыяльнасці 1-21 04 02-05*
*Мастацтвазнаўства (інтэграванае),*
*спецыялізацыі 1-21 04 02-05 01*
*Кампаратыўнае мастацтвазнаўства*

Мінск 2010

**Складальнік**

*В.П.Пракапцова,* загадчык кафедры беларускай і сусветнай мастацкай культуры ўстановы адукацыі “Беларускі дзяржаўны універсітэт культуры і мастацтваў”, доктар мастацтвазнаўства, прафесар

**Рэцэнзенты:**

*Э.А.Алейнікава,* загадчык кафедры гісторыі музыкі ўстановы адукацыі “Беларуская дзяржаўная акадэмія музыкі”, кандыдат мастацтвазнаўства, дацэнт;

*І.А.Смірнова,* загадчык кафедры мастацтва эстрады ўстановы адукацыі “Беларускі дзяржаўны універсітэт культуры і мастацтваў”, кандыдат мастацтвазнаўства, дацэнт

**Рэкамендавана да зацвярджэння:**

*кафедрай* беларускай і сусветнай мастацкай культуры ўстановы адукацыі “Беларускі дзяржаўны універсітэт культуры і мастацтваў” (пратакол № 5 од 14.11.2008 г.);

*прэзідыумам* навукова-метадычнага савета ўстановы адукацыі “Беларускі дзяржаўны універсітэт культуры і мастацтваў” (пратакол № 3 ад 08.12.2009 г.)

Адказны за рэдакцыю *І.В.Смяян*
Адказны за выпуск *В.П.Пракапцова*

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## ТЛУМАЧАЛЬНАЯ ЗАПІСКА

Праграма па дысцыпліне “Уводзіны ў спецыяльнасць” распрацавана для студэнтаў спецыялізацыі “кампаратыўнае мастацтвазнаўства”. Яна ўключае матэрыял па тэарэтычным і практычным азнаямленні з інтэграваным мастацтвазнаўствам. Праграма прадугледжвае першаснае ўваходжанне ў інавацыйную метадалогію кампаратыўнага аналізу, што патрабуе прынцыпова новых метадаў і праграм навучання. Таму першакурснікам дадзенай спецыялізацыі важна высветліць месца спецыялізацыі “кампаратыўнае мастацтвазнаўства” ў агульнай структуры універсітэта, наведаць і на практыцы азнаёміцца з месцамі захавання артэфактаў (Музей беларускіх народных музычных інструментаў, Галерэя мастацтваў універсітэта, Нацыянальны мастацкі музей і інш.) і навуковых першакрыніц па профілі спецыяльнасці (бібліятэка: аддзел мастацтваў, зала рэдкай кнігі).

Разам з тым студэнтам неабходна тэарэтычна ўсвядоміць тэндэнцыі развіцця сучаснага мастацтва, асэнсаваць іерархію мастацтваў, спецыфіку дзейнасці мастацтвазнаўцы, выкладчыка гісторыі мастацтваў.

Важным для засваення курса “Уводзіны ў спецыяльнасць” з’яўляецца яго інтэграцыя з гуманітарнымі (філасофія, гісторыя Беларусі), агульнапрафесійнымі (мастацтвазнаўчы семінар) і спецыяльнымі (кампаратывістыка ў мастацтвазнаўстве) дысцыплінамі абавязковага кампанента.

Метады навучання:

– рэпрадуктыўны (засваенне тэрміналогіі),

– праблемна-пошукавы (першапачатковае знаёмства з прыёмамі мастацтвазнаўчага аналізу),

– творчы (самастойны падбор мастацтвазнаўчых матэрыялаў па пэўных тэмах).

Знаёмства са з’явамі мастацтва адбываецца як на аўдыторных, так і на пазааўдыторных формах заняткаў (наведванне мастацкіх галерэй, музеяў, залы рэдкай кнігі бібліятэкі, канцэртных залаў і інш.).

Асноўная *мэта* курса – фарміраванне ўяўленняў аб спецыяльнасці “мастацтвазнаўства”, спецыялізацыі “кампаратыўнае мастацтвазнаўства”.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

У межах праграмы курса прадугледжана выкананне пэўных *задач*:

– даць уяўленне пра спецыялізацыю “кампаратыўнае мастацтвазнаўства”,

– вызначыць асновы тэарэтыка-метадалагічнай базы мастацтвазнаўства,

– набыць агульную інфармацыю аб навуковых першакрыніцах па профілі спецыяльнасці,

– засвоіць на практыцы сучасныя цэнтры захавання артэфактаў.

У выніку вывучэння дадзенага курса студэнт павінен *ведаць*:

– спецыфіку мастацтвазнаўчай дзейнасці,

– асноўныя мастацтвазнаўчыя крыніцы,

– тэндэнцыі развіцця прыкладнога мастацтвазнаўства.

Студэнт павінен *умець*:

– арыентавацца ў сучасных кірунках арт-дзейнасці,

– асвятляць панараму сучаснага мастацкага жыцця,

– асэнсоўваць мастацкі твор як прадмет даследавання.

На вывучэнне дысцыпліны “Уводзіны ў спецыяльнасць” тыпавым вучэбным планам прадугледжана 30 гадзін, з іх 18 гадзін аўдыторных (лекцыйных) заняткаў. Рэкамендаваная форма кантролю – залік.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## ПРЫКЛАДНЫ ТЭМАТЫЧНЫ ПЛАН

| Тэмы | Колькасць гадзін |
|---|---|
| | лекцыі |
| 1. Уводзіны: спецыялізацыя “кампаратыўнае мастацтвазнаўства” ў арганізацыйнай структуры універсітэта | 2 |
| 2. Кампаратыўнае мастацтвазнаўства як галіна гуманітарных навук | 4 |
| 3. Арганізацыя вучэбнага працэсу. Сучасная крэатыўная практыка як аснова кампаратыўнага аналізу | 2 |
| 4. Навукова-даследчая дзейнасць студэнтаў. Інфармацыйнае азнаямленне з навуковымі першакрыніцамі па мастацтвазнаўстве | 4 |
| 5. Арганізацыя самастойнай работы студэнтаў. Мастацтвазнаўства як кірунак арт-дзейнасці | 2 |
| 6. Інфармацыйная культура будучага спецыяліста. Кампаратыўнае мастацтвазнаўства як сукупнасць навуковых і вучэбных дысцыплін | 2 |
| 7. Метадалогія кампаратыўнага мастацтвазнаўства. Дыялог мастацтваў і сродкаў іх выразнасці ў творчасці XX – пачатку XXI ст.: кампаратыўны аналіз | 2 |
| **Усяго…** | **18** |

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## ЗМЕСТ ДЫСЦЫПЛІНЫ

### Тэма 1. Уводзіны: спецыялізацыя “кампаратыўнае мастацтвазнаўства” ў арганізацыйнай структуры універсітэта

Узаемадзеянне спецыялізацыі “кампаратыўнае мастацтвазнаўства” з іншымі спецыяльнасцямі факультэта культуралогіі і сацыякультурнай дзейнасці Беларускага дзяржаўнага універсітэта культуры і мастацтваў. Кваліфікацыйная характарыстыка спецыяліста-мастацтвазнаўцы. Змест будучай прафесіі.

### Тэма 2. Кампаратыўнае мастацтвазнаўства як галіна гуманітарных навук

Кампаратыўнае мастацтвазнаўства як інтэграваная навука, якая вывучае агульныя прыкметы, падабенствы і адрозненні сродкаў выразнасці ў розных відах мастацтва. Сэнсавы сінкрэтызм як дамінанта комплекснага ўспрымання свету, яго акустычнага (інтанацыйнага) і візуальнага, часавага і прасторавага ўспрымання. Параўнальнае вывучэнне твораў розных відаў мастацтва, устанаўленне агульных прыкмет і індывідуальных характарыстык тэкстуальнай інфармацыі.

### Тэма 3. Арганізацыя вучэбнага працэсу. Сучасная крэатыўная практыка як аснова кампаратыўнага аналізу

Агульнаадукацыйныя і прафілюючыя дысцыпліны. Тэарэтычнае і практычнае засваенне ведаў. Дыялагічнасць сродкаў выразнасці ў сучаснай творчай практыцы. Вялікі аб’ём і якасная разнастайнасць творчай інфармацыі, што правакуе пошук новых сродкаў і метадаў засваення і аналізу мастацкага тэксту. Жанравая разнастайнасць у музычным мастацтве як аснова прынцыпу формаўтварэння ў выяўленчым і кінамастацтве. Развіццё навуковага кругагляду і самастойнасці аналітычнага мыслення.

### Тэма 4. Навукова-даследчая дзейнасць студэнтаў. Інфармацыйнае азнаямленне з навуковымі першакрыніцамі па мастацтвазнаўстве

Даследаванні па гісторыі і тэорыі мастацтваў. Вядучыя мастацтвазнаўцы XX ст. і іх навуковыя працы. Практычнае

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

азнаямленне з першакрыніцамі ў аддзеле мастацтваў бібліятэкі Беларускага дзяржаўнага універсітэта культуры і мастацтваў: мастацкія альбомы, манаграфіі, тэматычныя зборнікі і інш. Практычнае азнаямленне з першакрыніцамі ў зале рэдкай кнігі: старадрукі, кнігі з прыватных аўтарскіх калекцый, мініяцюрныя кнігі і інш. Падрыхтоўка мастацтвазнаўцы па сістэме: студэнт – магістрант – аспірант. Комплекснасць падыходу да арганізацыі навукова-даследчай работы студэнтаў.

### Тэма 5. Арганізацыя самастойнай работы студэнтаў. Мастацтвазнаўства як кірунак арт-дзейнасці

Фарміраванне навыкаў работы ў вучэбнай, прафесійнай, навуковай дзейнасці. Азнаямленне з музеем беларускіх народных музычных інструментаў Беларускага дзяржаўнага універсітэта культуры і мастацтваў. Параўнальнае вывучэнне акустычных і дэкаратыўных якасцей музычных інструментаў як фактар фарміравання цікавасці да самастойнай пазнавальнай дзейнасці. Практычнае засваенне метаду кампаратыўнага аналізу, у прыватнасці  на аснове матэрыялаў экспазіцыі Галерэі мастацтваў Беларускага дзяржаўнага універсітэта культуры і мастацтваў, Нацыянальнага мастацкага музея Беларусі. Аналіз атрыманай інфармацыі і выбар сродкаў і метадаў вырашэння праблемнай аналітычнай сітуацыі.

### Тэма 6. Інфармацыйная культура будучага спецыяліста. Кампаратыўнае мастацтвазнаўства як сукупнасць навуковых і вучэбных дысцыплін

Інтэграцыя навуковых ведаў. Кампаратыўнае мастацтвазнаўства і сістэма мастацтвазнаўчых навук: тыповыя кантэкстныя якасці. Кампаратыўнае мастацтвазнаўства і мастацкая дзейнасць: гістарычны вопыт і сучасныя практыкі. Віды мастацтва: моўны дыялог. Кампаратыўнае мастацтвазнаўства ў сістэме вучэбных дысцыплін: тэорыя і гісторыя мастацтваў, аналіз твораў мастацтва, мастацтвазнаўчы семінар і інш. Інтэрпрэтацыя мастацкага твору і мастацкая крытыка. Інфармацыйная культура мастацтвазнаўцы і асэнсаванне мастацкіх каштоўнасцей на аснове адзінства эмацыянальнага і інтэлектуальнага ўспрымання свету.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## Тэма 7. Метадалогія кампаратыўнага мастацтвазнаўства. Дыялог мастацтваў і сродкаў іх выразнасці ў творчасці XX – пачатку XXI ст.: кампаратыўны аналіз

Сэнсавы дыялог мастацкіх твораў у розных відах мастацтва. Дыялог сродкаў выразнасці: гук і колер, час і прастора, тэмбр і каларыт і г.д. Узроўні-элементы сістэмы кампаратыўнага падыходу да даследавання і аналізу твораў розных відаў мастацтва: тэарэтычны (рытм, лічба, прапорцыя, час, прастора, форма, сімволіка, кампазіцыя, структура); структурны (сінтаксіс, семантыка, змест, жанр, форма). Прынцып дыялогу мастацтваў у творчасці М.Чурлёніса, А.Скрабіна і інш. Цесная ўзаемасувязь гісторыка-тэарэтычных метадаў кампаратыўнага аналізу.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

# ІНФАРМАЦЫЙНАЯ ЧАСТКА

## Літаратура

*Асноўная*

1. *Бонфельд, М.Ш.* Введение в музыковедение: учеб. пособие для студ. высш. учеб. заведений / М.Ш.Бонфельд. – М.: ВЛАДОС, 2001. – 224 с.: ноты.

2. *Введение* в литературоведение: основные понятия и термины: учеб. пособие / Л.В.Чернец [и др.] / под ред. Л.В.Чернец. – М.: Высш. шк.: Академия, 1999. – 555 с.

3. Введение в музыковедение: курс лекций / сост. Т.А.Щербакова. – Мн.: Бел. гос. академия музыки, 1999. – 86 с.

4. *Прокопцова, В.П.* Компаративизм в искусстве: диалогичность средств выразительности в музыке и живописи / В.П.Прокопцова // Пытанні мастацтвазнаўства, этналогіі і фалькларыстыкі: у 2 ч. Ч. 2. Праблемы тэатральнага, музычнага і кінатэлемастацтва ў кантэксце славянскіх культур у сучасным свеце / ІМЭФ НАН Беларусі; навук.рэд. А.І.Лакотка. – Мн.: Бел. навука, 2007. – С. 244–250.

5. *Прокопцова, В.П.* Компаративное искусствоведение: проблемы исследования / В.П.Прокопцова // Актуальные проблемы мировой художественной культуры: в 2 ч.: материалы Междунар. науч. конф., 25–26 марта 2004 г., Гродно / отв. ред. У.Д.Розенфельд. – Гродно: ГрГУ, 2004. – Ч. 1. – С. 18–22.

6. *Прокопцова, В.П.* Компаративизм в искусстве: историко-теоретическое обоснование / В.П.Прокопцова // Весці Беларускай дзяржаўнай акадэміі музыкі. – 2007. – № 10. – С. 70–77.

7. *Паўлава, С.А.* Уводзіны ў спецыяльнасць: метад. дапам. / С.А.Паўлава. – Мн.: Бел. дзярж. ун-т культуры і мастацтваў, 2009. – 56 с.

*Дадатковая*

1. *Алейнікава, Э.А.* Музычныя аспекты паэзіі Максіма Багдановіча / Э.А.Алейнікава // Весці АН БССР. Сер. грамад. навук. – 1986. – № 2. – С. 9–14.

2. *Апполон.* Изобразительное и декоративное искусство. Архитектура: терминологический словарь / под общ. ред. А.М.Кантора. – М.: Эллис Лак, 1997. – 736 с.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

3. *Маркези, Г.* Опера: путеводитель / Г.Маркези; пер. с итал. Е.Гречаной. – М.: Музыка, 1990. – 338 с.

4. *Олейникова, Э.А.* Поэзия и музыка: к проблеме структурно-композиционных и интонационно-звуковых аналогий / Э.А.Олейникова // Белорусское историческое музыкознание: научные парадигмы, тенденции, перспективы: науч. тр. – Мн.: Бел. гос. акад. музыки, 2008. – С. 3–16.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*Вучэбнае выданне*

**УВОДЗІНЫ Ў СПЕЦЫЯЛЬНАСЦЬ**

*Вучэбная праграма*
*па спецыяльнасці 1-21 04 02*
*Мастацтвазнаўства (па напрамках),*
*напрамку спецыяльнасці 1-21 04 02-05*
*Мастацтвазнаўства (інтэграванае),*
*спецыялізацыі 1-21 04 02-05 01*
*Кампаратыўнае мастацтвазнаўства*

Рэдактар І.В.Смяян
Тэхнічны рэдактар Л.М.Мельнік

Падпісана ў друк 2010 г. Фармат $60x84^{1}/_{16}$.
Папера пісчая № 2. Ум. друк. арк. 0,45. Ул.-выд. арк. 0,31.
Тыраж экз. Заказ .

УА “Беларускі дзяржаўны універсітэт культуры і мастацтваў”.
220007, г. Мінск, вул. Рабкораўская, 17.
Ліцэнзія № 02330/0131818 ад 02.06.2006 г.

Надрукавана на рызографе
УА “Беларускі дзяржаўны універсітэт культуры і мастацтваў”.
220007, г. Мінск, вул. Рабкораўская, 17.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ